**1.**То напой кісла-салодкі.
Ён — шэдэўр нашых продкаў.

Што на рошчыне рабілі:
Муку бралі, кіпень лілі,

Ў хлебную дзяжу ўсё клалі
Ды вадою залівалі.

А ўжо потым ў цёпла месца
Ўвесь настой, што там, у дзежцы,

Ставілі, каб "адпачыў",
Пасля хутка ўзбрадзіў.

Закіс крыху, памацнеў,
Стаў празрыстым, пасвятлеў.

Каб настой меў пэўны колер,
Клалі соладу даволі.

А для водару падчас
Дадавалі кмін ураз,

Мёд, вашчыну або мяту —
Пах вярэдзіў усю хату:

Водар моцны, моцны дух!
Асалода й толькі! Ух!

**2.**Ягад розных назбіралі,
Асцярожна перабралі

Па парадку, пакрысе
У міску іх кладзем усе:

Буякі, агрэст, брусніцы,
Вішні, слівы і чарніцы.

Сок мы станем выціскаць
З ягад , у місцы, што ляжаць.

Вадкасць у шклянку выліваем,
Жамерыны ў ваду кідаем.

Варым дзесьці мінут дваццаць,
Выключаем, даем " счахнуць".

Адвар трэба працадзіць,
Адну частку астудзіць,

У яе дадаць крухмалу
(сыпаць ціхенька, памалу).

Што да часткі да другой,
Засыпем мы ў яе з табой

Цукру. На пліту паставім,
Мёду крышачку дабавім,

Мяты лісце пакладзём,
Да кіпення давядзём.

У адвар, што атрымалі,
Выльем сок, што выціскалі,

Ды разведзены крухмал —
Ставім зноў адвар на жар.

**3.**Каб [яе] прыгатаваць,
Трэба крыху мёду ўзяць,

Разбаўтаць яго ў вадзе —
Напой гатовы — піце ўсе:

І кабеты, і малыя,
І нямоглыя старыя.

Падмацоўвайце здароўе —
Пітво зроблена з любоўю.

Продкі многія гады
[яе] часта на дзяды

Ці памінкі гатавалі
Ды асобна падавалі

Да жалобнага стала.
[яе]  на ім заўжды была.

А таксама на Каляды
[яе]  вельмі былі рады.

Ёй закрашвалі куццю,
Кісель, кашы, ежу ўсю.

Надышло сапраўдна свята —
На стале [яе]  багата!

Самастойна як пітво
У пост ва ўжытак яно ішло:

[яе]  шмат тады рабілі,
Амаль не елі, толькі пілі.

| № п/п | Назва беларускага традыцыйнага напою | Назва твора мастацкай літаратуры, у якім гэты напой прыгадваецца | Аўтар | Жанр |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Квас | “Новая зямля”<br>“Зямля пад белымі крыламі” | Я.Колас<br>У.Караткевіч | Паэма<br>Нарыс |
| 2 | Кісель | “Новая зямля”<br>“Зямля пад белымі крыламі” | Я.Колас<br>У.Караткевіч | Паэма<br>Нарыс |
| 3 | Сыта | “Новая зямля”<br>“Зямля пад белымі крыламі” | Я.Колас<br>У.Караткевіч | Паэма<br>Нарыс |